**Halina Twaranowicz**
(Białystok)

# Да праблемы культурна-гістарычнага тыпу славянскага фарміравання

Кожны народ уяўляе сабой вялікую тыпаяўгенічную таямніцу, гістарычную загадку, глыбока прыхаваную ў сутарэннях часу. Неспавядальныя шляхі шматаблічнага славянства знаходзяць пэўнае тлумачэнне ў непаўторнай асаблівасці яго культурна-гістарычнага тыпу, як цэласнай сукупнасці характэрных элементаў духоўнага і матэрыяльнага жыцця этнасу. І цяпер, на пачатку новага мілeніуму, аглядаючы вопыт адзінкавага і агульнага, з поўнай адказнасцю можна гаварыць аб перспектыўнасці даследавання гістарычных лёсаў славянства менавіта пад кутом гледжання тэорыі культурна-гістарычных тыпаў. Трэба з удзячнасцю ўзгадаць, што сфармуліраваў яе яшчэ ў другой палове XIX ст. ў кнізе *Россия и Европа* (Спб. 1871) Н. Я. Данілеўскі, падразумяваючы пад культурна-гістарычным тыпам своеасаблівую культуру з унікальнымі мастацкімі, рэлігійнымі, сацыяльна-эканамічнымі асаблівасцямі. Н.Я. Данілеўскі сцвярджаў, што ў аснове кожнай з культур у якасці яе энергетычнага цэнтру ляжыць нацыянальны пачатак, здольны да развіцця, дзякуючы ўкладзенай у яго боскай энергіі [Данилевский, 1991: 91–113]. Актуальнасць такога разумення гістарычнага шляху народаў ужо са збыткам пацверджана парадаксальнасцю нашага часу, калі ў дадатак да шэрагу элементарных праблем фізічнага выжывання, чалавецтва аказалася перад пагрозай страты свайго твару, сваёй асабовасці. І перш за ўсё ўсведамленне кожным народам свайго духоўнага патэнцыялу, культурна-гістарычнай глебы садзейнічае супрацьстаянню татальнай уніфікацыі, агрэсіўнаму наступу масавай культуры і, нарэшце, суперцывілізаванаму гэтым разам змяшэнню „языкаў".

Шматгадовае даследаванне беларуска-паўднёваславянскіх літаратурных узаемасувязей ад іх вытокаў да канца XIX ст. дазволіла нам зрабіць некаторыя ўдакладненні ў тэорыю культурна-гістарычных тыпаў, у прыватнасці, культурна-гістарычнага тыпу славянскага фарміравання. Засяроджанасць на працяглай гістарычнай дыстанцыі дала магчымасць выбудаваць рабочы тыпалагічны рад, сыходзячы не з асобных эпізодаў, а параўнальна закончаных перыядаў. Ёсць

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

падставы сцвярджаць, што культурна-гістарычны тып славянскага фарміравання праяўляе сябе найбольш поўна перш за ўсё ў трыадзінстве працэсаў: 1) этнічны шлях; 2) выразная народная архетыпізацыя гэтага шляху вусна-паэтычнай творчасцю; 3) адлюстраванне гэтага самаруху жыцця прафесійным мастацтвам.

Адносіны да этнічнага шляху як асновы трыады культурна-гістарычнага тыпу абумоўлены заканамернасцямі развіцця саміх народаў, разгортваннем ў часе іх пасіянарных, стваральных магчымасцей. Свае выразныя абрысы культурна-гістарычны тып славянскага фарміравання набываў у перыяд дамінацыі ў Еўропе Свяшчэннай Рымскай імперыі і Візантыі, як дзвюх асноўных тагачасных грамадска-палітычных сіл, што разам з абумоўленым вераспавядальнымі адрозненнямі спосабам адаптацыі, перапрацоўкі фальклорна-этычнай традыцыі выпрацоўвала своеасаблівы характар літаратурнага развіцця, культурных сувязей.

На эвалюцыю ўсходне- і паўднёваславянскіх літаратур, культуры, духоўнасці амаль да XVII ст. самым непасрэдным чынам ўплывала якраз візантыйская цывілізацыя са сваім асаблівым менталітэтам. Узнікненне візантыйскай дзяржавы адбылося на мяжы крушэння позняй антычнасці і нараджэння сярэднявечнага грамадства, у чым найперш трэба бачыць яе гістарычны феномен. Геаграфічна Візантыя таксама знаходзілася на мяжы ўсходу і захаду, на скрыжаванні разнастайных уплываў з Еўропы, Азіі, Афрыкі. Спалучэнне грэка-рымскіх і ўсходніх традыцый фарміравала адметныя грамадскае жыццё, дзяржаўнасць, рэлігійна-філасофскія ідэі, культуру і мастацтва.

Адным з важнейшых вынікаў падзелу Рымскай імперыі стала замацаванне адрозненняў паміж праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі, што з'яўлялася шмат у чым люстэркам супярэчнасцей грамадскай структуры, духоўнага жыцця Візантыі і Рыма. Між тым аб лёсаносай ролі традыцый Рыма або Візантыі выразна сведчыць духоўны, культурны шлях паўднёвых славян. Практычна аднародныя некалі плямёны сербаў, харватаў, славенцаў, аказаўшыся ў сферы ўплыву розных хрысціянскіх канфесій, сфарміравалі своеасаблівыя культуры, набылі адметны псіхалагічны воблік. Вядома, канчатковае замацаванне ў пэўных традыцыях – вынік шматвяковага працэсу. На пачатку станаўлення славянскай літаратурнай гісторыі – IX і часткова XI стст. – рэгіянальныя граніцы пісьменства былі пераважна досыць няпэўнымі. Тлумачыцца гэта паралельнасцю і аднаснай сінхроннасцю пранікнення хрысціянства на славянскія землі як з Усходняй, так і Заходняй імперый. Старажытнаславянскія літаратуры па тым часе ўтваралі тры рэгіёны. Першы, найбольш буйны па этнаграфічным арэале, ахопліваў землі чэхаў, панонскіх славян, цяперашніх славакаў, частку плямён на поўдні будучай Польшчы, цяперашнія Славенію, Харватыю, Сербію. З пункту погляду суіснавання тут усходнехрысціянскай абрадавасці, пісьмовасці на стараславянскай і лацінскай мовах гэты раён адносяць да амбівалентных. Захаваліся агульныя тагачасныя помнікі. Аднак

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

ужо ў X ст. пачынае ўзрастаць роля лаціны і ўвасабляемага ёю тыпу культуры, што сведчыць пра пачатак новага этапу ў гісторыі старажытнаславянскіх пісьменстваў гэтага рэгіёна. Выключэннем стала адна Сербія, дзе з прыходам да ўлады дынастыі Няманічаў канчаткова ўсталявалася пісьмовасць на старaславянскай мове, што далучыла Сербію да другога рэгіёна. Ён, у адрозненне ад першага, па свайму вобліку гетэрагеннага, насіў гамагенны характар, што абумоўлена прыняццем хрысціянства з адной крыніцы – Візантыі. Гэты культурны тып прадстаўлены старажытнабалгарскім, старажытнарускім і з XII ст. старажытнасербскім пісьменствам. Гамагенным, але іншай культурнай арыентацыі, з'яўляўся і трэці рэгіён, утвораны польскім, а затым харвацкім і славенскім, а з XI ст. – чэшскім і славацкім рэгіёнамі.

І менавіта хрысціянізацыя ўсходнеславянскіх зямель спрычынілася галоўным чынам да іх асветы, узнікнення кніжна-літаратурнай традыцыі. Хрысціянства ўсходнія славяне прынялі ў 988 годзе. Пэўны адказ на пытанне, чаму якраз у грэчаскім, візантыйскім варыянце, дае першы ўсходнеславянскі летапіс Аповесць мінулых гадоў. Паслы кіеўскага князя Уладзіміра пасланы былі ім вывучаць рэлігійныя абрады да немцаў, балгараў, і грэкаў: „Хадзілі да балгараў, глядзелі як яны моляцца ў храме, называемым мячэццю, стаяць там распаясаныя: зрабіўшы паклон, сядзе і глядзіць туды-сюды, як вар'ят і няма ў іх весялосці і толькі журба і смурод вялікі. Не добры закон іхні. І прыйшлі мы да немцаў і бачылі ў храмах іхніх розную службу, але прыгажосці не бачылі ніякай, і прыйшлі мы ў грэчаскую зямлю, і ўвялі нас туды, дзе служаць яны богу свайму, і не ведалі – на небе ці на зямлі мы; бо няма на зямлі такога відовішча і прыгажосці такой і не ведаем, як і расказаць аб гэтым. Знаем толькі, што знаходзіцца там Бог з людзьмі і служба іхняя лепшая, чым ва ўсіх іншых краінах. Не можам мы забыць прыгажосці тае, бо кожны чалавек, калі зазнае салодкага, не возьме пасля горкага, так і мы не можам ужо тут быць у паганстве" [Изборник, 1969: 67–68].

Зразумела, канкрэтнае рэлігійнае веравызнанне, абранае на ўсходнеславянскіх землях, было вынікам і асаблівасцей гістарычнага развіцця, і геаграфічнага размяшчэння ўсходніх славян, і пэўных палітычных ды культурна-гаспадарчых сувязей. Аднак відавочна, што сталую дынаміку працэс развіцця культуры і асветы набывае якраз з прыняццем хрысціянства. Гэта з Візантыі, дзякуючы ахвярнаму падзвіжніцтву роўнаапостальных братоў Кірыла і Мяфодзія, славяне атрымалі першую ўпарадкаваную азбуку, пераклад з грэчаскай мовы многіх кніг, што і пачало фарміраваць старажытнарускую літаратурную мову ды кніжную справу.

У *Аповесці мінулых гадоў* галоўнаю падставаю для абрання ўсходнімі славянамі, русінамі хрысціянскага веравызнання ва ўсходнім варыянце названа ПРЫГАЖОСЦЬ, уласна асноўная катэгорыя эстэтыкі. Менавіта ж на прынцыпах прыгажосці, гармоніі арганізавана, трымаецца сама светабудова. Відаць, паслы князя Уладзіміра пабывалі ў канстанцінопальскім,

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

сталічным храме св. Сафіі, ўзведзеным у 532–537 гг. на высокім пагорку побач з імператарскім палацам, далёка бачным з мора і сушы – не толькі сімвале магутнасці Візантыі, але і галоўнай святыні хрысціянскага Усходу. Тагачасны паэт Карып называў св. Сафію цудам свету, якое засланяе ўсё хараство і раскошу храма Саламона ды ўяўляе сабой дакладнае адлюстраванне самога неба... Такім чынам, у працытаваным вышэй фрагменце летапісу ці не ўпершыню пісьмова заявіла пра сябе адна з вызначальных рыс культурна--гістарычнага тыпу славянскага фарміравання: перавага пачуцця, эмоцыі – над залагізаванымі, штучнымі разумовымі пабудовамі.

З рэдкай паслядоўнасцю разгортваецца лёс славянства: найчасцей „з агня ды ў полымя", без віны вінаватыя. Тым выразней у гэтым поступу праз суцэльныя іспыты бачна вернасць высокім ідэалам хрысціянства, чаму сведчаннем – знітаванасць гісторыі і культуры, гэтак яскрава выяўленая ва унікальнай народнай творчасці. Вялікі польска-беларускі паэт Адам Міцкевіч у сваіх парыжскіх лекцыях падкрэсліваў, што менавіта славянскаму, асабліва косаўскаму эпасу, належыць ідэя поўнага хрысціянскага самаадрачэння, якое вызначыла новы этап у сусветнай паэзіі і новае яе прызначэнне [Мицкевич, 1954: 188]. У галоўнай сваёй сутнасці сербскі эпас паслядоўна выяўляў прыналежнасць да ідэалаў новазапаветнай цывілізацыі, новага летазлічэння, грамадзянін якога адказны не толькі за свае благія ўчынкі, але і заклікаваны да самаўдасканалення, высокай ахвярнасці, чысціні памкненняў, намераў, калі нават яны не заўсёды знаходзяць увасабленне ў канкрэтыцы жыццёвых сітуацый. Сербскі князь Лазар перад зямнымі дабротамі аддае перавагу смерці і царству Нябеснаму з яго вечнымі каштоўнасцямі. У асобе князя Лазара выяўляе сябе выразны этнічны архетып – квінтэсенцыя глыбіннай сутнасці народа, якая арганізуе знутры падзейную канву гістарычнага часу. Тут ужо ў поўную сілу праяўляе сябе другое звяно нашай трыяды: ідэалізацыя гераічных, архетыповых, менталітэтных пачаткаў як стэрэатыпа паводзін этнічнага соцыуму, інварыянта псіхічнага складу, нарэшце, зародка нацыянальнай эстэтыкі. Аб дадзенай з'яве з глыбокім разуменнем справы пісаў вядомы даследчык В. В. Ключэўскі: „Ёсць імёны, якія насілі гістарычныя людзі, што жылі ў пэўны час, спраўлялі гістарычна вядомую жыццёвую справу, але імёны, якія ўжо страцілі храналагічнае значэнне, выступілі па-за межы часу, калі жылі іхнія носьбіты. Гэта таму, што справа, здзейсненая такім чалавекам, па сваім значэнні гэтак далёка выходзіла за абсягі свайго веку, сваім дабратворным дзеяннем гэтак глыбока захапіла жыццё далейшых пакаленняў, што з асобы гэтага дзейсніка ў свядомасці гэтых пакаленняў паступова спадала ўсё часавае і мясцовае, і яна з гістарычнага дзеяча ператварылася ў народную ідэю, а сама справа яго з гістарычага факта зрабілася практычнай запаведдзю, запаветам, тым, што мы прызвычаіліся называць ідэалам" [Ключевский, 1993: 94].

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

Такія людзі бачацца гісторыку не проста вялікімі нябожчыкамі, а вячыстымі спадарожнікамі наступнікаў, нават праваднікамі. І цэлыя стагоддзі ўдзячна ўспамінаюцца іхнія дарагія імёны не столькі дзеля ўшанавання іхняй памяці, колькі для таго, каб самім не забыць іхніх запаветаў. У кожнага народа свой пантэон такіх спадарожнікаў. Для беларусаў найперш гэта – Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францішак Скарына, Францішак Багушэвіч.

Між тым на ўзроўні атаясамлівання славутага лёсу з ідэяй адначасова прасочваецца і працэс зараджэння эстэтычных адносін да рэчаіснасці. Не інакш як гэтак разумеў прыроду эпапеі М. М. Бахцін: „Нацыянальнае мінулае, свет „пачаткаў" і „вяршыняў" нацыянальнай гісторыі, свет бацькоў і родапачальнікаў, свет "першых" і „лепшых" [Бахтин, 1975: 456].

Вопыт гістарычнага развіцця ўсходне- і паўднёваславянскага этнасаў ставіць пад сумненне класічнае вызначэнне Адраджэння як абасобленага культурнага феномену еўрапейскай эпохі, суадносімага напрамую з выспяваннем у недрах феадальных адносін капіталістычнага ладу ў Заходняй Еўропе. Усё ж выдае на тое, што па вялікаму рахунку заходнееўрапейскі Рэнесанс быў паразаю ў строях пераможцы. Яго арыентацыя на антычнасць і франтальнае адмаўленне ад глыбінных хрысціянскіх каштоўнасцей былі чужароднымі для славянства, змушанага самаахвярна стагоддзямі супрацьстаяць ісламізацыі Еўропы, абараняць Айчыну, этнічныя, духоўныя ідэалы. XVI стагоддзе ў значнай ступені таму і сталася „залатой парой" для беларускай літаратуры, бо адраджалася духоўнасць, выпакутаваная, напрацаваная ў часы Еўфрасінні Полацкай, Кірыла Тураўскага, ачышчаліся глыбінныя крыніцы. Гульні са словам, хай сабе і вельмі таленавітай, аддавалася кесарава, а Богу належала Богава.

Геапалітычнае становішча Вялікага княства Літоўскага садзейнічала таму, што на яго тэрыторыі яскрава праявіліся разнаскіраваныя культурна-духоўныя пошукі новага часу. Славянскі тып культурнага фарміравання разгортваўся тут у шматграннай унікальнасці. Толькі заяўленыя раней тэндэнцыі ў XV–XVI стст набывалі акрэсленую сутнасць і форму, цяпер ужо абумоўленую рознымі шляхамі еўрапейскага Рэнесанса і, зразумела, своеасаблівасцю напрацаванай культурнай глебы. Гэта быў выразны працэс, бо ўжо дзейнічала ахавальная, плённая кансерватыўнасць традыцыі. Тое ядро, што вызначае арбіту духоўных, культурных памкненняў менавіта дадзенага, канкрэтнага народа. Вядома, развівацца (а не разбурацца) здольны арганізм, сцверджаны ў пэўных межах, рамках, якія дынамічна разгойдваюцца, пашыраюцца праз лучнасць з новым, калі гэтае новае, закадзіраванае пэўным чынам, ужо існуе на перыферыі традыцыі. Глыбока сімвалічна тое, што беларускі першаасветнік, першадрукар Ф. Скарына, спазнаўшы кніжнай мудрасці, асветы ў Кракаве, Падуі, Празе, геніяльна адчуў плённасць для свайго народа рэнесансавага шляху якраз у візантыйска-славянскай рэдакцыі. Непасрэдна з творчасці аўтара жамчужыны беларускага веку

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

*Песні пра зубра* Міколы Гусоўскага вынікае, што светабачаннем сваім паэт прадстаўляў славянска-візантыйскае Адраджэнне, адчуваў сябе спадкаемцам раннепатрыстычных хрысціянскіх каштоўнасцей. Пры гэтым М. Гусоўскі на практыцы ўвасабляў патрабаванні рэнесансавай эстэтыкі, якая адмаўляла сярэдневяковую ўмоўнасць, ідэальнасць бачання свету і чакала ад майстра фактуры, напоўненай канкрэтыкай жыццёвай матэрыі.

Згодна хрысціянскай этыцы, пакута уяўляе сабой найглыбінную быційную сутнасць, асноўны закон усякага жыцця [Бердяев, 1993: 111]. Цягам многіх вякоў выпрабаванне на вернасць жыццёвым каштоўнасцям, дадзеным чалавеку самім нараджэннем у пэўных традыцыях, мела для паўднёвых славян трагічны характар. Гвалтоўная хваля турэцкай экспансіі, якая, здавалася, нястрымна імкнула ўглыб Еўропы, губляла свае разбуральныя сілы на Балканах. Славянства сталася той ахвярай, што забяспечыла адносны спакой астатняму мацерыку. Напярэдадні XIX ст. сваю дзяржаўнасць мелі ўвогуле толькі два славянскія народы: рускія і чарнагорцы. Над паўднёвымі славянамі ўладарыла Атаманская Порта, над чэхамі і славакамі–аўстрыйская дынастыя Габсбургаў. У выніку трох ганебных падзелаў паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй цалкам страціла палітычную самастойнасць Рэч Паспалітая.

Між тым гістарычна-культурныя зрухі ў жыцці паўднёвых і заходніх славян у эпоху нацыянальнага адраджэння, фарміравання новай мастацкай традыцыі робяць ураджанне цуду. Народы, культурнае жыццё якіх у XVIII ст. ледзьве цеплілася, нібыта раптам ажылі і ў выніку імклівага ўздыму стварылі ўласную нацыянальную літаратуру (хоць, відавочна, для беларушчыны XIX ст. было перыядам напружаным, па-свойму трагічным). Цудадзейны імпульс паскоранага славянскага адраджэння зноў узняў – вярнуў на культурную арэну народы калісь слаўнага гераічнага мінулага, выявіўшы велізарныя нерэалізаваныя духоўна-этнічныя патэнцыі параўнальна маладога славянскага культурна--гістарычнага тыпу развіцця.

У XIX ст. культурна-гістарычны тып славянскага фарміравання выразна праяўляў сябе ў трыадзінстве працэсаў. Яшчэ адбывалася архетыпізацыя этнічнага шляху вусна-паэтычнай творчасцю, аднак той жа шлях ужо знаходзіў шматстайнае адлюстраванне і ў прафесійным мастацтве. Яшчэ гучна прамаўляў агульны генетычны код і моцнаю была прапамяць блізкіх паходжаннем народаў. Не патрабавалася вялікіх намаганняў, каб адшукаць карані – агульнае часта аказвалася навідавоку. Адначасова ўступала ў правы пара сучаснага літаратуразлічэння. Пачыналася інтэнсіўная культурная інтэграцыя, абумоўленая развіццём, пераменамі, якія суправаджаюць саму цывілізацыю. Уніфікаваны свет цывілізацыі нараджае уніфікаванае мастацтва. Магчыма, адбываецца спантаннае разбурэнне многіх цэласнасцей дзеля стварэння адной. Хочацца верыць, што дзякуючы вопыту ахвярнасці, цярпення, пераадолення пакуты, вернасці этнічным ідэалам славянскі тып культурна-гістарычнага

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

фарміравання захавае свой (па Н. Я. Данілеўскаму) энергетычны цэнтр, свае нацыянальныя пачаткі ў вітальнай размаітасці, шматстайнасці.

## Літаратура

Бахтин М. М., 1975, *Вопросы эстетики*, Москва.

Бердяев Н. А., 1993, *О назначении человека*, Москва.

Данилевский Н. Я., 1991, *Россия и Европа*, Москва.

*Изборник* (*Сборник произведений литературы Древней Руси*), 1969, Москва.

Ключевский В. О., 1993, *Афоризмы. Исторические портреты и этюды. Дневники*, Москва.

Мицкевич А., 1954, *Собр. соч.: в 5 т.*, т. 4, Москва.

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
**Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,**
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021